Галоўнае ўпраўленне па адукацыі
Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Лебедзеўская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна»

**Рэспубліканскі конкурс інфармацыйна-метадычных матэрыялаў
«Інавацыі ў дзейнасці дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў»**

# ПАЗНАВАЛЬНА-ГУЛЬНЯВЫ ПРАЕКТ «ГЭТА КРАЙ МОЙ, МАЯ РАДЗІМА!»

Матэрыялы з вопыту работы

аг.Лебедзева, 2022

Рэцэнзент:
намеснік дырэктара дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Маладзечанскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік»
Н.В.Шульжыцкая

Складальнікі:
Васілеўская Святлана Феліксаўна, намеснік дырэктара;
Алешка Ірына Міхайлаўна, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, каардынатар дзейнасці піянерскай дружыны імя Віктара Посаха
ў рамках інавацыйнай дзейнасці

Рэкамендавана
метадычным саветам дзяржаўнай установы адукацыі «Лебедзеўская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна»
упраўлення па адукацыі
Маладзечанскага раённага выканаўчага камітэта
«28» кастрычніка 2021 г., протокол № 2

**Пазнавальна-гульнявы праект «Гэта край мой, мая Радзіма!»** / склад. С. Ф. Васілеўская, І. М. Алешка; Лебедзеўская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна. – аг. Лебедзева, 2022. – 26 с.

У пазнавальна-гульнявым праекце змяшчаецца апісанне вопыту работы па рэалізацыі інавацыйных праектаў «Укараненне мадэлі фарміравання і развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў у сістэме ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі і дзіцячых, маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў», «Укараненне мадэлі дзіцяча-дарослай супольнасці як механізма фарміравання новых сацыяльных практык у рэгіянальнай адукацыйнай прасторы». Апісаны займальныя формы і метады выхаваўчай работы, асноўныя механізмы стварэння сацыяльна-выхаваўчага асяроддзя, якое забяспечвае фарміраванне і развіццё камунікатыўнай кампетэнтнасці навучэнцаў у сістэме ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі і дзіцячых, маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў. Матэрыялы вопыту дазваляюць удасканальваць педагагічную падтрымку дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў (ГА «БРПА» і ГА «БРСМ»), арыентуюць на лідарства.

Рэкамендуецца педагогам-арганізатарам, педагогам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

© Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Лебедзеўская сярэдняя школа
Маладзечанскага раёна»

**Змест**

Актуальнасць 4

Інфармацыйна-педагагічная карта праекта 6

Інфармацыйная гадзіна «Планета за адзін тыдзень» 7

Гісторыка-геаграфічная гульня «Пра Беларусь я ведаю ўсё» 10

Экскурсійны маршрут аг.Лебедзева – в.Маліноўшчына – аг.Лебедзева «Дарогамі нашых продкаў» 15

Калектыўная творчая справа «Беларуская кухня. Аперацыя «Дранікі. Смачна есці!» 23

Заключэнне 25

Літаратура і інфармацыйныя рэсурсы 26

## Актуальнасць

На сённяшні час, калі глабалізацыя ў сувязі з эканамічнымі прычынамі ахоплівае ўвесь свет, паўстае пытанне аб неабходнасці захавання народамі сваёй этнічнай і культурнай самабытнасці. Да таго ж праблематычным для многіх дзяржаў постсавецкай прасторы (не толькі для нашай) з’яўляецца пошук свайго ўласнага шляху ў сучасным эканамічным і палітычным развіцці. Вырашэнне гэтых задач патрабуе ўдзелу ў грамадскім жыцці адукаванай асобы – грамадзяніна з выпрацаванай патрыятычнай пазіцыяй, багатым духоўным светам, яркага лідэра, здольнага павесці за сабой іншых.

Дзяржава выступае ў якасці сацыяльнага інстытута, у якім чалавек засвойвае нормы паводзін, асэнсоўвае свае правы і абавязкі ў адносінах да іншых, уносіць свой уклад у сацыяльнае, эканамічнае, палітычнае і духоўнае развіццё грамадства.

Такім чынам, відавочна, што любая дзяржава ўзмацняецца законамі, агульнымі правіламі, мэтамі і стратэгіяй развіцця – канкрэтнай ідэалогіяй. Мэтай ідэалогіі з’яўляецца прывіццё падрастаючаму пакаленню асноўных каштоўнасных арыенціраў, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці і фарміруюць актыўную грамадзянскую і асабістую пазіцыю моладзі ў будаўніцтве моцнай і аўтарытэтнай дзяржавы.

Асноўнымі каштоўнаснымі арыенцірамі пазнавальна-гульнявога праекта «Гэта край мой, мая Радзіма!» з’яўляюцца наступныя:

развіццё нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскай пазіцыі;

фарміраванне любові да Радзімы і гонару за сваю краіну;

асэнсаванне гістарычнай, культурнай і духоўнай самабытнасці беларускага народа;

фарміраванне адказных паводзін, уменне супрацьстаяць дэструктыўнай ідэалогіі і асацыяльным праявам;

развіццё навыкаў здаровага ладу жыцця, самадысцыпліны.

Адным з цэнтральных накірункаў дзейнасці дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў нашай установы адукацыі з’яўляецца ўключэнне лідараў ГА «БРПА» і ГА «БРСМ» у мерапрыемствы, якія садзейнічаюць выхаванню патрыятызму, пачуцця грамадзянскай адказнасці, любові і павагі да сваёй краіны, фарміравання духоўных якасцей. У сувязі з гэтым педагогамі падрыхтаваны распрацоўкі інфармацыйных і класных гадзін, экскурсій, віртуальных падарожжаў і іншых мерапрыемстваў, якія прапануюцца ў дадзеным праекце.

Кожны настаўнік разумее, што сёння грамадства мае патрэбу не толькі ў адукаваных, эрудыраваных спецыялістах, а і ў высокамаральных, выхаваных грамадзянах – прыхільніках ідэалаў дабра і справядлівасці. Таму неабходна перайсці да новай якасці адукацыі, у якой увесь адукацыйны працэс установы адукацыі павінен быць падпарадкаваны адной мэце – выхаванню Чалавека, Грамадзяніна, Творцы.

Педагагічны калектыў школы ў працэсе адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці стварае ўсе неабходныя ўмовы для выхавання патрыятызму як

духоўнага кампанента асобы грамадзяніна, для фарміравання павагі да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, павышэння ўзроўню ідэалагічнай і палітычнай свядомасці, развіцця гуманізму, міласэрнасці, павагі да пажылых людзей і, вядома ж, выхавання любові да роднай зямлі.

Любіць сваю Радзіму, адчуваць яе адзінства магчыма пры ўмове ведання яе традыцый і культуры, разумення працэсаў, якія адбываюцца ў краіне, у свеце.

## Інфармацыйна-педагагічная карта праекта

| № п/п | Назва | Анатацыя |
|---|---|---|
| 1 | Назва праекта | Пазнавальна-гульнявы праект «Гэта край мой, мая Радзіма!» |
| 2 | Мэта праекта | Стварэнне ўмоў для грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, для вывучэння гісторыі свайго краю, асэнсавання духоўнай, гісторыка-культурнай самабытнасці беларускага народа праз пазнавальна-гульнявыя формы работы |
| 3 | Педагагічныя задачы | Распрацаваць і ўкараніць ва ўстанове адукацыі навукова-метадычнае і інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне выхаваўчай работы з навучэнцамі ў дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднаннях.<br>Развіваць лідарскія якасці асобы навучэнца і творчы патэнцыял членаў ГА «БРПА», ГА «БРСМ».<br>Садзейнічаць фарміраванню поглядаў і перакананняў, каштоўнасных арыенціраў, адказных паводзін, умення супрацьстаяць дэструктыўным ідэям і асацыяльным праявам праз займальныя формы выхаваўчай работы, сацыяльна карысную дзейнасць і падтрымку дзіцячых ініцыятыў.<br>Фарміраваць актыўную грамадзянскую пазіцыю, пачуццё гонару за сваю краіну |
| 4 | Структура | Інфармацыйная гадзіна «Планета за адзін тыдзень»<br>Гісторыка-геаграфічная гульня «Пра Беларусь я ведаю ўсё»<br>Экскурсійны маршрут аг.Лебедзева-в.Маліноўшчына-аг.Лебедзева «Дарогамі нашых продкаў»<br>Калектыўная творчая справа «Беларуская кухня. Аперацыя «Дранікі.Смачна есці!»<br>Відэафільм «Дранікі.Смачна есці!»<br>https://disk.yandex.by/d/bUkvoiiwGtzfJQ |
| 5 | Удзельнікі | Члены ГА «БРПА», ГА «БРСМ», класныя кіраўнікі, педагог-арганізатар, настаўнікі, законныя прадстаўнікі |

## Інфармацыйная гадзіна
## «ПЛАНЕТА ЗА АДЗІН ТЫДЗЕНЬ»

*Складальнік: Сляшынская А.А., настаўнік біялогіі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, класны кіраўнік VIII класа*

**Мэта:** фарміраванне ў навучэнцаў патрэбнасці быць у курсе сучасных падзей, развіццё здольнасці разумець іх сутнасць і наступствы.
**Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне:** палітычная карта свету, каляндар, выстава «Свет за тыдзень», палітычны слоўнік.
**Форма правядзення:** вусны часопіс

### Ход інфармацыйнай гадзіны:

**1. Уступная частка**

Класны кіраўнік:

Грамадзянін, патрыёт – гэта найбольш важныя агульначалавечыя каштоўнасці. Высокае званне грамадзяніна патрабуе ад нас усведамлення ўласнай адказнасці за лёс Айчыны. Патрыятызм з'яўляецца найбольш важнай маральнай якасцю чалавека і выражаецца ў яго светапоглядзе, маральных ідэалах, нормах паводзін.

Для таго, каб зрабіць правільны выбар, трэба арыентавацца ў коле сучасных падзей, умець вызначыць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю, адчуць уласнае сацыяльнае значэнне, свядома ўдзельнічаць у грамадскім жыцці краіны. Грамадзяніну неабходна ведаць аб дзяржаўнай унутранай і знешняй палітыцы, шляхах вырашэння праблем у розных галінах, тэндэнцыях развіцця нашага грамадства, аб стратэгічных напрамках міжнароднай дзейнасці, падпісанні дагавораў, удзеле Рэспублікі Беларусь у вырашэнні міжнародных канфліктаў. Не абысціся сёння і без інфармацыі аб сітуацыі ў іншых краінах, глабальных экалагічных праблемах і шляхах іх вырашэння. Усе гэтыя веды дапамогуць вам у вызначэнні ўласнай пазіцыі – пазіцыі адукаванай, законапаслухмянай, творчай, нацыянальна-свядомай асобы, здаровай фізічна і маральна.

Размова на палітычныя тэмы заўсёды складаная і сур'ёзная. Ваша цікавасць да адносін паміж дзяржавамі, а таксама паміж урадам і народам у краінах дасць магчымасць падарожнічаць па заблытаных лабірынтах палітыкі і спасцігаць тайны дыпламатыі.

**2. Асноўная частка**

Справаздача групы «Даты і падзеі» (каляндар знамянальных дат)

Выкарыстанне розных крыніц (прэса, інтэрнэт-крыніцы, агульнанацыянальныя тэлеканалы). Група рыхтуе інфармацыю аб значных датах і падзеях гісторыі гэтага тыдня. Затым, выкарыстоўваючы розныя крыніцы (кнігі, фатаграфіі, плакаты, слайды-прэзентацыі), група трансліруе матэрыял і дае каментарыі да яго. Напрыклад:

- 4 сакавіка – Дзень міліцыі;
- 5 сакавіка – 126 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка Кандрата Крапівы;
- 8 сакавіка – Міжнародны жаночы Дзень;
- 10 сакавіка – 76 гадоў з дня нараджэння беларускага кінаакцёра і рэжысёра Уладзіміра Гасцюхіна.

Справаздача групы «Асноўныя падзеі тыдня ў свеце».

Група рыхтуе ў бібліятэцы агляд перыядычнага друку за тыдзень. Настаўнік каменціруе, удакладняе, дапаўняе. Зрабіць інфармацыйную гадзіну цікавай, эмацыянальнай дапамогуць гульнявыя прыёмы:

*«Гарачыя кропкі планеты»* – дзецям прапануюцца карткі з назвамі «гарачыя кропак»; яны павінны расказаць пра падзеі ў гэтай кропцы, паказаць і абазначыць яе на карце;

*«Палітычны слоўнік»* – з выкарыстаных тэрмінаў выбраць адзін і растлумачыць яго значэнне без падрыхтоўкі.

Справаздача групы «Інтэрнэт-навіны».

Група знаёміць клас з інфармацыяй, якая была падрыхтавана з выкарыстаннем камп’ютара, найбольш цікавых сайтаў навін, якія даюць уяўленне пра падзеі ў свеце і нашай краіне. На стадыі падрыхтоўкі настаўнік павінен даць групе спіс інтэрнэт-крыніц для атрымання інфармацыі.

Справаздача групы «Навіны Рэспублікі Беларусь»

Група рыхтуе агляд беларускіх газет у бібліятэцы на працягу тыдня. Астатнія навучэнцы задаюць пытанні па кожнай рубрыцы, дапаўняюць выступленні сваімі паведамленнямі. Гэта калектыўнае абмеркаванне якога-небудзь спрэчнага пытання. Мэтай яго з’яўляецца ўключэнне ў пошук магчымых спосабаў вырашэння канкрэтнай праблемы, дае магчымасць кожнаму вызначыць сваю ўласную пазіцыю, агучыць яе і навучыцца абараняць.

Палітычнае лато. З разрэзаных літар група навучэнцаў складае палітычныя тэрміны і дае ім тлумачэнне. Правільнасць адказаў правяраецца па слайдах.

**3. Заключная частка**

Класны кіраўнік. Гісторыя заўсёды скіравана наперад. Ваша пакаленне, якому належыць будучыня краіны, павінна натхняцца ўсім лепшым, што ёсць у нашага народа. Вызначыць сваё месца ў грамадстве павінен кожны. А дапамогуць вам тут веды, добрая інфармаванасць, самаадданасць і ўпэўненасць у правільнасці ўласнай пазіцыі.

Падвядзенне вынікаў. Пасля завяршэння работы ідзе не толькі абмен інфармацыяй паміж групамі, але і абмеркаванне, аналіз падзей. Класны кіраўнік павінен быць гатовы даць ацэнку падзеям, гістарычную даведку, а таксама падвесці вынікі, якія дапамогуць навучэнцам выпрацаваць уласныя адносіны да дадзенай падзеі.

**4. Рэфлексія**

Навучэнцы ставяць фішку пад адным з сімвалаў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ! | ? | - | + |

! – было цікава і зразумела
? – засталіся пытанні без адказу
– нічога не зразумеў
+ – упершыню навіны аказаліся для мяне зразумелымі і нясумнымі

**Гісторыка-геаграфічная гульня**
**«ПРА БЕЛАРУСЬ Я ВЕДАЮ ЎСЁ»**

*Складальнік: Шыцік І.А., настаўнік рускай мовы*
*і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры*
*вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі;*
*класны кіраўнік X класа*

**Мэта:** выхаванне патрыятычных пачуццяў да роднага краю, гісторыі сваёй Радзімы і заахвочванне да спасціжэння самабытнага характару беларусаў, іх мовы, культуры.
**Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне:** гульнявое табло, камп'ютар, мультымедыйны праектар (для відэафільма), выстава кніг «Гэта мая Радзіма», беларускі куточак.
**Форма правядзення:** гульня

**Ход гульні**

*(Гучыць песня «Беларусь» у выкананні Л. Ялінскай, дэманструецца відэафільм пра Беларусь)*

**1. Уступная частка**

Класны кіраўнік**:** эпіграфам да нашай гульні будуць словы Я.Коласа:
Мой родны кут, як ты мне мілы,
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны маёй убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю...
Хлопчык *(у нацыянальным касцюме):*
Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.
Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма! ( Ніл Гілевіч)
Дзяўчынка *(у нацыянальным касцюме):*
Дзе рэчкай, дзе борам, дзе лугам.
Ты вабіш сабою здаля,
Зямля між Дняпром і між Бугам,
Спрадвечная наша зямля. (Алесь Бачыла)

**2. Асноўная частка**

Класны кіраўнік**:** перад вамі гульнявое табло, на ім схаваны сектары. Каманды па чарзе выбіраюць літару і сектар, адпаведны ёй, і

адказваюць на пытанне. За правільны адказ каманда атрымлівае 3 балы, за няпоўны – 2 балы альбо 1, а калі адказ адсутнічае – 0 балаў. Калі каманда не дае адказу, гэта можа зрабіць іншая каманда і атрымаць дадатковыя балы. Час на абдумванне адказаў – 30 секунд.

Правільнасць адказаў ацэньвае журы ў складзе: (прадстаўленне журы). Поспехаў камандам! У добры шлях!

ГУЛЬНЯВОЕ ТАБЛО:

| | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| **А** | ЗНАКАМІТЫЯ ЛЮДЗІ | НАСУСТРАЧ ПЕРАМОЗЕ | МАТЧЫНА МОВА |
| **Б** | БЕЛАРУСКІЯ КРАЯВІДЫ | ВІКТАРЫНА | КРАЙ НАРАЧАНСКІ |
| **В** | АБРАДАВЫЯ СВЯТЫ | ВАНДРОЎКА ПА БЕЛАРУСІ | З ГЛЫБІНІ СТАГОДДЗЯЎ |

**А-1 «Знакамітыя людзі»**

1. Знакаміты беларус, палачанін, чыім асабістым сімвалам была выява сонца. (Францыск Скарына)

2. Вялікая беларуская асветніца, манахіня, полацкая князёўна, нябесная заступніца беларускай зямлі. (Еўфрасіння Полацкая)

3. Першы ўладальнік звання «Герой Беларусі» (Уладзімір Мікалаевіч Карват, падпалкоўнік авіяцыі)

**А-2 «Насустрач Перамозе»**

1. Які дзень лічыцца днём вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў? (3 ліпеня 1944 года)

2. Назавіце прозвішча маці пяці сыноў, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Малодшы з іх – Пётр – удастоены звання Героя Савецкага Саюза. (Купрыянава Н.Ф.)

3. Каму належыць партызанскі псеўданім Бацька Мінай? (Мінай Філіпавіч Шмыроў, Герой Савецкага Саюза, у гады Вялікай Айчыннай вайны ўзначальваў партызанскі атрад)

**А-3 «Матчына мова»**

1. З чым звязаны назвы месяцаў года ў славянскіх народаў:

- ЛЮТЫ (маразы)
- ЛІПЕНЬ (цвіценне ліп)
-СНЕЖАНЬ (зямля пакрываецца снегам)
- СЕРПЕНЬ (сярпом жалі жыта)
- ТРАВЕНЬ (зелянеюць травы)

2. Закончы прыказку:

Слова, як птушка: … (выпусціў – не зловіш)
Найсмачнейшы хлеб … (ад сваёй працы)
Родная зямля мякчэйшая … (за чужую пярыну)

3. Перакладзі з рускай на беларускую мову:
Бусы, сковорода, диван, зеркало, ковёр, чулок, носки, вор, кирпич, утюг, хищник, спички. (Каралі (пацеркі), патэльня, канапа, люстэрка, дыван, панчоха, шкарпэткі, злодзей, цэгла, прас, драпежнік, запалкі)

**Б-1 «Беларускія краявіды»**

1. Што называюць «жамчужынай Беларусі»? (Возера Нарач)

2. Толя дамовіўся са сваім сябрам сустрэцца на беразе Бярэзіны, у адзін і той жа час здзяйсняючы падарожжа на лодках. Толя плыў ад вытока да вусця, а Саша – наадварот. Абодва сябры ажыццяўлялі падарожжа, але сустрэча не адбылася. Як такое магло стацца? (Адна Бярэзіна ўпадае ў Днепр, другая – у Нёман)

3. У газеце «7 дзён» за сакавік 1999 года было паведамленне: «У Паўночна-Прыпяцкім раёне Рэспублікі Беларусь адкрыта 30 алмазных трубак, а ў 5-ці з іх знойдзены каштоўныя мінералы. Праўда, яны аднолькавыя, невялікія па памерах». Ці верыце вы такому паведамленню? (Так)

**Б-2 «Віктарына»**

1. Як называюцца людзі, ад якіх мы паходзім. (Продкі)

2. Назавіце сталіцу нашай рэспублікі. (Горад Мінск)

3. Пералічыце абласныя гарады нашай рэспублікі. (Мінск, Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў)

4. Пералічыце краіны, з якімі мяжуе Беларусь. (Расія, Украіна, Польшча, Літва, Латвія)

5. Каго называюць беларускім першадрукаром? (Францішка Скарыну)

6. Які горад на гербе мае выяву бягучага аленя? (Гродна)

7. Назавіце самы старажытны горад Беларусі. (Горад Полацк, 862 год)

**Б-3 «Край Нарачанскі»**

1. Дайце геаграфічную даведку «Геаграфічнае становішча возера Нарач»: у якой частцы Беларусі, у межах якой нізіны? (Паўночны захад Беларусі, Нарачана-Вілейская нізіна)

2. У якім годзе і з якой мэтай быў створаны Нацыянальны парк «Нарачанскі»? (1999 год, для захавання ландшафтаў, біялагічнага багацця і генетычнага фонду расліннага і жывёльнага свету)

3. У возера Нарач і Саргасавага мора, што знаходзіцца ля берагоў Паўночнай Амерыкі, ёсць цудоўная сувязь. Хто звязвае гэтыя вадаёмы і што вам вядома пра жыхароў Нарачы? (Вугры, якія на нераст плывуць у Саргасава мора)

**В-1 «Абрадавыя святы»**

1. Вечарам моладзь збіралася каля рэчкі, паліла вогнішча, вадзіла карагоды. І яшчэ быў таямнічы звычай... Назавіце гэты звычай і само свята. (Купалле, пошук папараць-кветкі)

2. Не было ў славян двара, дзе б не адзначалі гэтага свята, якое прыходзіцца на канец лютага – пачатак сакавіка. Гэта свята цягнецца ўвесь тыдзень. Апошні дзень яго – «пацалуйны дзень», ці «прабачная нядзеля». У

гаршчочку тое, што з'яўляецца часткай свята. Што гэта, пра якое свята ідзе гаворка? (Бліны, свята – Масленіца)

3. Да гэтага свята рыхтаваліся загадзя. Абавязковай стравай была багатая куцця. У гэты вечар варажылі пра будучы ўраджай. На другі дзень хадзілі батлейкі – калядоўшчыкі. Калі гэта было? (На Каляды)

**В-2 «Вандроўка па Беларусі»**

1. Назавіце самыя старажытныя гарады Беларусі. (Полацк, Тураў, Мінск, Пінск, Бярэсце, Навагрудак)

2. Пры раскопках старажытнага горада ў Мінску знайшлі майстэрню ювеліра, у якой у XII стагоддзі выраблялі фігуркі з дрэва. Царква забараняла рабіць і гуляць з імі. Што гэта за фігуркі? (Шахматы)

3. Адзін са сродкаў перамяшчэння ў гарадах Беларусі ў 90-х гадах XIX стагоддзя. Яго называлі «пудзілам прахожых». Губернатар падпісаў пастанову аб забароне хуткай язды па горадзе, рухацца дазвалялася толькі па правым баку, у руках трымаць нумар. Што гэта? (Веласіпед)

**В-3 «З глыбіні стагоддзяў»**

1. Якая падзея ў гісторыі Беларусі звязана з 1410 годам? Назавіце значэнне гэтай падзеі для нашага народа. (Грунвальдская бітва, канец 250-гадовай крыжацкай навалы)

2. Вядомы палітык, грамадскі і палітычны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Займаў пасады пісара дзяржаўнай канцылярыі, канцлера, гетмана. Абараняў незалежнасць ВКЛ ад Масквы і Польшчы. Падрыхтаваў і выдаў Статут 1588 года. Хто гэта? (Леў Сапега)

3. Назавіце дату заснавання суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. (15 сакавіка 1994 года, дзень прыняцця Канстытуцыі)

**Пытанні для балельшчыкаў**

1. У печы варыцца ў вопратцы, а да стала ідзе раздзетай. (Бульба)
2. Што жанчына зробіць з гаршчочкам, перш чым пачне варыць у ім ежу? (Паглядзіць у яго)
3. У кутку барада на кійку. (Мятла)
4. Круглае, гарбатае, вакол махнатае, як прыйдзе бяда – пацячэ вада. (Вока)
5. На гары – гай, пад гаем – маргай, пад маргаем – хапай. (Галава)
6. Хто ходзіць зранку на чатырох, днём на двух, а вечарам – на трох? (Чалавек у розным узросце)
7. Вярхом сядаю, на каго – не знаю, знаёмага ўбачу – адразу падскочу. (Капялюш)
8. У жываце – лазня, на носе – рэшата, на галаве – пупок, адна рука – і тая на спіне. (Чайнік)

**3. Заключная частка**

<u>Класны кіраўнік:</u> (узнагароджанне каманд-пераможцаў)
Пераможцамі нашай гульні можна па праву лічыць не толькі абедзве каманды, але ўсіх прысутных, таму што цяга да ведаў, да пазнання гісторыі і геаграфіі нашага народа, нашых каранёў – вялікая і цікавая справа. А завяршыць нашу

гульню хацелася б словамі паэта:

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
Разумею цяпер, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе ляцяць… (Алесь Ставер)

**4. Рэфлексія**

Класны кіраўнік**:** перад вамі «Карабель настрою» і тры віды сцяжкоў (чырвоныя, блакітныя і жоўтыя). Пазначце свой удзел і настрой сцяжком пэўнага колеру:
ЧЫРВОНЫ – я прымаў актыўны ўдзел, мне спадабалася.
БЛАКІТНЫ – мне спадабалася, але я не вельмі актыўна ўдзельнічаў.
ЖОЎТЫ – мне было сумна і нецікава.

**Экскурсійны маршрут**
аг.Лебедзева-в.Маліноўшчына-аг.Лебедзева
**«ДАРОГАМІ НАШЫХ ПРОДКАЎ»**




*Складальнік: Рудая С.Я., настаўнік фізічнай культуры і здароўя вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі*

**Мэта:** фарміраванне ў навучэнцаў цікавасці да гісторыі роднага краю.
**Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне:** карта экскурсійнага маршрута, камп'ютар.
**Форма правядзення:** экскурсійны маршрут

Лебедзева – адзін з самых старажытных і прыгажэйшых населеных пунктаў Маладзечанскага раёна: узгоркі, нізіны, ледавіковыя равы, марэнны рэльеф, рака Нявежа, крыніцы. У далёкім мінулым праз Лебедзева праходзілі гандлёвыя шляхі з Прыбалтыкі на ўсход і на поўдзень, што садзейнічала яго гаспадарчаму і культурнаму развіццю.

Гісторыя нашага краю цікавая і павучальная, а мясцовыя жыхары – сапраўдныя патрыёты. Быць патрыётам – гэта не толькі любіць сваё – зямлю, дзе нарадзіўся, сваіх бацькоў і народ, сваю культуру і мову. Гэта нешта большае. Важна пакінуць свой след у жыцці, перадаць эстафету здзяйсненняў і дасягненняў наступным пакаленням. Для патрыёта абавязкова ведаць гісторыю свайго роду і роднай зямлі.

Карані майго сямейнага роду знаходзяцца на Лебедзеўскай зямлі, таму я заўсёды цікавілася гісторыяй роднага краю. Прапанавала вучням разам знаёміцца з цікавымі гістарычнымі фактамі, легендамі, паданнямі аб прыродзе, аб жыхарах Лебедзеўшчыны.

Для рэалізацыі праграмы запрасіла вучняў, якія жывуць у в.Маліноўшчына. Дзеці любяць падарожнічаць, таму работу арганізавалі ў выглядзе гульні-экскурсіі «Па дарогах гісторыі». Вырашылі стаць экскурсаводамі (вельмі спадабалася слова «гід»). Нейкі час не маглі

вызначыцца з выбарам маршрута. Давялося накіраваць думкі дзяцей на стварэнне экскурсійнага маршрута «Лебедзева-Маліноўшчына-Лебедзева».

Ідэя арганізацыі работы ў выглядзе гульні-падарожжа па знаёмых дарогах, але невядомых гістарычных звестках аб гэтых дарогах, аказалася захапляючай і пазнавальнай. Спачатку мы распрацавалі маршрут экскурсіі, пры дапамозе бацькоў зрабілі схему маршрута, вызначылі аб’екты для азнаямлення, вымералі адлегласць, якую неабходна прайсці, разлічылі час экскурсіі.

**Карта экскурсійнага маршрута**




Экскурсія пачынаецца каля памятнага каменя, на якім указаны час першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах пра в.Лебедзева. Працягласць маршрута каля 9 км. Пры сярэдняй скорасці руху пешшу 4 км/г з прыпынкамі для азнаямлення з вызначанымі аб’ектамі, з прыпынкам для адпачынку на аграсядзібе «Аколіца» экскурсія будзе працягвацца каля 4 гадзін.

У ходзе калектыўнага абмеркавання былі вызначаны наступныя аб’екты для азнаямлення (указана адлегласць ад памятнага каменя):

1. Аграгарадок Лебедзева (цэнтральная плошча)
2. Рэчка Нявежа і млын (810 м)
3. Вёска Маліноўшчына (4,1 км)
4. Старажытны шлях з Мінска ў Крэва і Вільню (5,6 км)
5. Аграсядзіба «Аколіца» (500 м)
6. Помнік спаленым жыхарам в.Лебедзева (6,7 км)
7. Лебедзеўская капліца (7,3 км)
8. Лебедзеўская сярэдняя школа (8,3 км)

Да збору матэрыялаў пра аб’екты, уключаныя ў экскурсійны маршрут, далучыліся бацькі вучняў. Разам працавалі ў бібліятэках, у школьным музеі, сустракаліся са старэйшымі жыхарамі вёсак Лебедзева, Маліноўшчына, Лабачоўка, знаходзілі цікавыя звесткі ў інтэрнэце.

Для кожнага пункта экскурсійнага маршрута разам з вучнямі пісалі апавяданні-апісанні, якія аб'ядналі ў буклет «Па дарогах гісторыі (Лебедзева – Маліноўшчына – Лебедзева)».

## ВЁСКА ЛЕБЕДЗЕВА




Першае пісьмовае сведчанне пра вёску Лебедзева зафіксавана ў даравальнай грамаце вялікага князя літоўскага Ягайлы 25 красавіка 1387 года. Вёска Лебедзева мела выгаднае геаграфічнае становішча. Праз яго праходзіў старадаўні шлях з Менска на Крэва і Вільню.

Паводле легенды на месцы вёскі было вялікае возера, на якім жылі лебедзі. З возера выцякала рэчка Нявежа, у тыя часы глыбокая і паўнаводная. Людзі шанавалі прыгожых і гордых птушак, лічылі, што яны ахоўваюць возера. Але знайшоўся злы чалавек, які застрэліў самага вялікага лебедзя-важака. З таго часу лебедзі пакінулі возера.Спатрэбілася ўсяго тры дні, каб вада назаўсёды выцекла са сваёй катлавіны-чашы, сплыла ў вялікую раку. А людзі пачалі сяліцца на дне былога Лебядзінага возера. Паселішча называлася Лебедзева дно.

Пазней ад назвы засталася толькі першая частка – Лебедзева…

## Рэчка НЯВЕЖА, млын



Назва рэчкі Нявежы балцкага паходжання і перакладаецца з літоўскай мовы як «бруістая», «струменістая». Выток рэчкі знаходзіцца ў канцы вуліцы Крынічнай, цячэ Нявежа праз Лебедзева, каля в. Мароські і ўпадае ва Ушу за 3 км на ўсход ад в. Турэц-Баяры. У старажытнасці Нявежа была глыбокая, шырокая, паўнаводная, цяпер жа больш падобная да ручая, бо вады ў ёй па шчыкалатку. Яшчэ ў далёкай мінуўшчыне, калі існавала возера, а рака Нявежа была паўнаводнай, у Лебедзеве дзейнічаў вадзяны млын запруднага тыпу, звесткі пра які ёсць у інвентары ад 7чэрвеня 1535 г. Пазней, калі знікла возера, а Нявежа абмялела, механізм, які круціў вялікія жорны напорам вады, сталі прыводзіць у рух запрэжаным канём, а пасля вайны конскую цягу замяніла электрычнасць. У цяперашні час млын не працуе.

## МАЛІНОЎШЧЫНА



Упершыню вёска Маліноўшчына згадваецца ў інвентары 1579г. як засценак Лебедзеўскага двара. Засценкам, як вядома, называўся хутар або невялікае паселішча дробнай шляхты. Назва Маліноўшчына гаворыць сама за сябе. Па ўспамінах старажылаў у мясцовым лесе Альшанцы былі вялікія зараснікі дзікай маліны. Вакол былі некранутыя лясныя ўгоддзі з балотамі і вадаёмамі, дзе вадзілася багата ўсякай жыўнасці.

Да 16 ст. в. Маліноўшчына ўваходзіла ў Лебедзеўскія ўладанні князёў Гальшанскіх. Пазней перайшла ва ўласнасць Радзівілаў. У 1765г. засценак купіў Юзаф Якуб Свентажэцкі, і на працягу двух з паловай стагоддзяў (да 1939г.) ён належыў гэтаму шляхецкаму роду, пераходзячы ад бацькі да сына.

Цяпер на тэрыторыі колішняга маёнтка роду Свентажэцкіх дзейнічае прадпрыемства «Маліноўшчызненскі спіртагарэлачны завод «Аквадзіў», на прамысловай пляцоўцы якога захавалася капліца-пахавальня роду Свентажэцкіх.

## СЯДЗІБА СВЕНТАЖЭЦКІХ




Сядзіба Свентажэцкіх у вёсцы Маліноўшчына была і застаецца адным з самых знакамітых аб’ектаў у ваколіцах Лебедзева. На сённяшні момант яна з’яўляецца помнікам сядзібна-паркавага мастацтва першай паловы XIX – 30-х гг.XX ст. Гісторыя сядзібы надзвычай багатая, яна адносіцца да найбольш цікавых помнікаў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Маладзечанскага раёна.

Больш падрабязна пазнаёміцца з сядзібай можна ў час асобнай экскурсіі.

## СТАРАЖЫТНЫ ШЛЯХ з МІНСКА ў КРЭВА і ВІЛЬНЮ



З в.Маліноўшчына ідзём у паўднёвым напрамку па палявой дарозе і выходзім на дарогу, якая вяла ў старажытнае Крэва і далей у Вільню. Ісці і ехаць па гэтай дарозе адна асалода: па абодва бакі зелянеюць палі аграфірмы «Лебедзева», дзе-нідзе стаяць старыя бярозы – рэлікты даўніх прысад. Адзін пагорак, другі, трэці… І так да самага Лебедзева.

Не раз і не два ішлі па гэтай дарозе салдаты еўрапейскіх армій. У 1708 годзе праз Лебедзева прайшлі палкі шведскага караля Карла XII. У канцы 1812 года па гэтай дарозе ўцякаў на захад Напалеон. У пагоні за ім па гэтай дарозе прайшоў вядомы паэт і важак партызан Дзяніс Давыдаў.

Праязджалі па гэтай дарозе вядомыя кампазітары М.Агінскі і С.Манюшка, паэты Т.Шаўчэнка і У.Сыракомля, Ф.Багушэвіч і В.Дунін-Марцінкевіч, і шмат іншых вядомых людзей.

## АГРАСЯДЗІБА «АКОЛІЦА»



Адпачыць у час экскурсіі запрашаюць гаспадары аграсядзібы «Аколіца», якая знаходзіцца на адлегласці 600 м ад дарогі Маладзечна – Маркава на выедзе з Лебедзева ў заходнім напрамку.

Сядзіба стаіць у маляўнічым месцы на месцы былога хутара ў акружэнні векавых ліп. Для адпачынку ёсць крытая альтанка, пляцоўка для пляжнага валейболу.

Тут можна ўбачыць розных хатніх жывёл і птушак, прагуляцца па садзе.

Гаспадары аграсядзібы заўсёды рады гасцям і забяспечаць прыемны адпачынак.

## ЛЕБЕДЗЕЎСКІ ХАЛАКОСТ



У ліпені 1941г. на тэрыторыі в.Лебедева было арганізавана яўрэйскае гета, якое было акальцавана калючым дротам. Жыло ў ім 600-700 чалавек, якім было забаронена пакідаць тэрыторыю без дазволу нямецкіх улад. Страшная трагедыя здарылася 24 чэрвеня 1942 г. Нямецкія карнікі разам з мясцовымі паліцаямі акружылі гета і пагналі яўрэяў у напрамку в. Маркава. Прыкладна за вярсту ад Лебедзева стаяла гумно мясцовага жыхара. Яўрэяў расстрэльвалі групамі, заганяючы па чарзе ў гумно. Жывыя скідвалі мёртвых у кучу, якую фашысты палівалі гайзолем. Калі ўсіх расстралялі, гумно падпалілі, раненых людзей дабівалі. Нікога не засталося ў жывых. Цяпер на месцы расправы над мірнымі жыхарамі стаіць сціплы помнік, да якога ў дні памяці прыходзяць лебедзеўцы.

## ЛЕБЕДЗЕЎСКАЯ КАПЛІЦА




Капліца на парафіяльных могілках у в. Лебедзева была пабудавана ў 1910 г. як радавая пахавальня. Помнік архітэктуры неаготыкі з рысамі мадэрну. Капліца вылучаецца з шэрагу шматлікіх аналагаў вытанчанасцю прапорцый і багаццем дэкору. Нягледзячы на тое, што пабудавана больш за 100 год таму, яна здаецца новабудоўляй: цагліны не згубілі свой колер, як і ружова-малінавы колер раствору вонкавай кладкі.

У 60-ых гадах мінулага стагоддзя яе закрылі, аднак аб’явілі помнікам архітэктуры.Вярнулі гэтую святыню каталіцкай супольнасці Лебедзеўскай парафіі ў пачатку 90-ых гадоў. Пасля рэстаўрацыі капліца дзейнічаючая.

**Калектыўная творчая справа**
**«БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ. АПЕРАЦЫЯ «ДРАНІКІ. СМАЧНА ЕСЦІ!»**

*Складальнік: Алешка Ірына Міхайлаўна, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, каардынатар дзейнасці піянерскай дружыны імя Віктара Посаха ў рамках інавацыйнай дзейнасці*

**Мэта:** пашырэнне ведаў аб традыцыях беларусаў, развіццё цікавасці да нацыянальнай культуры, творчай актыўнасці, патэнцыяльных магчымасцей дзяцей малодшага школьнага ўзросту.
**Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне:** камп'ютар.
**Форма правядзення:** калектыўная творчая справа з удзелам законных прадстаўнікоў

**Ход справы:**

**1. УСТУПНАЯ ЧАСТКА:**

**Бабчыны дранікі**

Бабка ўстала раненька,
Да святла,
І гарачых дранікаў
Напякла.
Дранікаў-бульбянікаў –
Смакаты,
Дранікаў-бульбянікаў
Залатых.
– Ешце, ешце, дзетачкі,
Па талерцы поўненькай!
Еш, унучка-кветачка,
Еш, унучак-сонейка!
*(Алесь Пісьмянкоў)*

**Класны кіраўнік:** беларуская зямля вядома сваёй прыгожай прыродай, чысцінёй азёраў і рэк і, канешне ж, шматлікімі славутасцямі. Але адна з іх заслугоўвае асаблівай увагі… Нацыянальную беларускую кухню можна смела назваць адной з самых унікальных славутасцей нашай краіны. У беларускай кухні ёсць свой нацыянальны каларыт і свая чароўнасць.

Бульбашы – так называюць беларусаў. Гэта звязана з тым, што ў нашым рацыёне бульба традыцыйна адыгрывае вялікую ролю.

Смажаная і адвараная, тушаная і ў выглядзе пюрэ, выступае як гарнір і як асноўная страва. Нават калі вы не вялікі аматар гэтай гародніны, вы не зможаце ўтрымацца перад беларускімі дранікамі – настолькі яны духмяныя і апетытныя!

Гэта візітоўка кухні Беларусі. Рэцэпт, дарэчы, быў запазычаны з нямецкай кухні і ўпершыню апісаны ў кнізе «Кухар добра навучаны» у 1830 годзе. Кулінарныя традыцыі беларусаў – гэта прастата народных рэцэптаў.

Старажытныя рэцэпты беларускай кухні захаваліся да нашых дзён і карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў турыстаў і гасцей, якія наведваюць нашу краіну.

На Беларусі бульба не звядзецца,
А беларусу бульба не прыесца,
Скажу вам, братцы, гэта не сакрэт,
Мне бульба замяняе нават хлеб.

Сярод дзясяткаў страў, вы мне паверце,
Ёсць самая смачнейшая на свеце,
За свята лічыць кожны беларус,
калі ўранку ставяць на абрус.

Прыпеў:
Дранікі духмяныя,
Дранікі крамяныя.
Дранікі бульбяныя – любата,
Дранікі са шкваркамі,
Дранікі з паджаркамі,
Дранікі – сапраўдная смаката.

На Беларусі бульба не звядзецца,
А беларусу бульба не прыесца,
Не буду я тужыць і сумаваць,
Пакуль у печы дранікі шкварчаць.

*(П. Макаль, 2003 г., Песняры)*

Пасля знаёмства з нацыянальнай беларускай кухняй, а менавіта са стравамі з бульбы (беларускімі дранікамі), навучэнцы атрымалі заданне: з удзелам законных прадстаўнікоў падрыхтаваць відэафільм «Дранікі. Смачна есці!»

Відэафільм «Аперацыя «Дранікі. Смачна есці!» (сям'я Радзівона Мячкоўскага) быў прызнаны лепшым (https://disk.yandex.by/d/bUkvoiiwGtzfJQ).

## Заключэнне

Звышзадачай адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі з'яўляецца выхаванне падрастаючага пакалення. Рашэнне гэтай звышзадачы вельмі эфектыўна ажыццяўляецца праз вывучэнне жыццёвых вытокаў гісторыі нашай Радзімы і жыцця краіны ў цяперашні час. Менавіта актыўны ўдзел лідараў ГА «БРПА», ГА «БРСМ» у калектыўных творчых справах, класных і інфармацыйных гадзінах, іншых мерапрыемствах, якія ажыццяўляюцца праз займальныя формы, сацыяльна-адобраную дзейнасць, праз праяўленне і падтрымку дзіцячых ініцыятыў, стала яркім прыкладам фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі, пачуцця гонару за сваю краіну, адказных паводзін.

Уменне супрацьстаяць дэструктыўным ідэям і асацыяльным праявам, прымяненне навучэнцамі ў рэальным жыцці ведаў, уменняў і сацыяльнага вопыту, набытых у працэсе арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў, – незаменны сродак выхавання Чалавека – патрыёта, інтэлектуала, працаўніка, творцы.

Хочацца верыць, што нашы разумныя, актыўныя і таленавітыя дзеці будуць шчаслівымі і ў дарослым жыцці, што каштоўнасныя арыенціры, падораныя кожнаму з іх роднай школай, прарастуць кветкамі дабрыні і хараства.

## Літаратура і інфармацыйныя рэсурсы


1. Кодекс Республики Беларусь об образовании : с изм. и доп. по состоянию на 21 сент. 2016 г. – Минск : Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2016. – 400 с.
2. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 гг. : Утверждена Постановлением Министерства образования Республики Беларусь : 31 декабря 2020 г., № 312 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf .
3. Бабчанок, М. А. Беларуская фалькларыстыка : аказіянальныя абрады і паэзія : дапаможнік / М. А. Бабчанок. – Мінск : БДПУ, 2010. – 72 с.
4. Беларускія народныя абрады / Склад., навук. Рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994.
5. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы : зборнік / склад. Ф. Янкоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 493 с
6. Бутрамееў, У. Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай / У. Бутрамееў. – Мінск : Беларус. энцыкл. 1995.
7. Марціновіч, Алесь. Святая Еўфрасіння Полацкая, альбо Адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля / Алесь Марціновіч. – Мінск : Беларусь, 2008.
8. Нацыянальны парк «Нарачанскі» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://vetliva.by/belarus/what-to-see/natsionalnyy-park-narochanskiy/.
9. Суменков, И. А. Основные направления гражданско-патриотического воспитания // Социально-гуманитарные тенденции : история и современность / И. А. Суменков [Электронный источник] : сборник статей II-ой Международной научно-практической конференции (16 ноября 2018 г., г. Тюмень). – Западный : Научно-исследовательский центр «АнтроВита», 2018.

**Матэрыял да Рэспубліканскага конкурсу**
**інфармацыйна-метадычных матэрыялаў**
**«Інавацыі ў дзейнасці дзіцячых і мадзёжных грамадскіх аб'яднанняў»**

# ПАЗНАВАЛЬНА-ГУЛЬНЯВЫ ПРАЕКТ «ГЭТА КРАЙ МОЙ, МАЯ РАДЗІМА!»

Матэрыялы з вопыту работы


Складальнікі:
Васілеўская Святлана Феліксаўна
Алешка Ірына Міхайлаўна



Адказны за выпуск *С.Ф.Васілеўская*

Камп'ютарная вёрстка *С.Ф.Васілеўская*



Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Лебедзеўская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна»

222315, аг. Лебедзева, вул. Савецкая, 37а,
Маладзечанскі раён, Мінская вобласць;
Тэл.: (8 0176) 545048, тэл./факс: (8 0176) 545048
E-mail: lebedevo@uomrik.gov.by
Сайт: http://lebedevo.uomrik.gov.by/